ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ І ВЕТЭРЫНАРЫЯ

УДК 636.2.034.082.263

А. М. ЯКУСЕВІЧ, Я. І. БЕКЕШ

МАЛОЧНАЯ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ КАРОЎ ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ ГАЛШТЫНАЎ

Галштынская парода малочнай жывёлы істотна адрозніваецца ад іншых пародаў высокім генетычным патэнцыялам малочнай прадукцыйнасці і прыстасаванасцю да прамысловай тэхналогіі догляду. Яна шырока выкарыстоўваецца ў многіх краінах свету для паляпшэння іншых пародаў жывёлы. У нашай краіне галштынская парода ў значных маштабах выкарыстоўваецца за апошнія 10—15 гадоў. На яе аснове прадугледжана стварэнне новых высокапрадукцыйных пародаў і ўнутрыпародных тыпаў з удоем кароў 5000—7000 кг. У Беларусі ствараецца занальны ўнутрыпародны тып чорна-пярэстай жывёлы з удоем 6—7,5 тыс. кг пры тлустасці малака 3,7—3,8%. Праграмай прадугледжана прыліццё крыві галштынаў да 1/2, 5/8 і 3/4 долі. Для работы выкарыстоўваюцца тры генеалагічныя лініі — Віс Айдыяла 933122, Рыфлекшн Саверынга 198 998 і Монтвік Чыфтэйна 95 679, на аснове якіх мяркуецца стварыць чатыры заводскія лініі. Іншыя лініі галштынскай пароды выкарыстоўваюцца для ўдасканальвання заводскага тыпу чорна-пярэстай жывёлы, створанага на галандскай аснове. Пры гэтым, каб не парушыць існуючую структуру тыпу, скарыстоўваецца метад уводнага скрыжавання.

Колькасць жывёлін ствараемага тыпу ў гаспадарках усіх катэгорый складае 110 тыс. галоў, у тым ліку кароў — 45 тыс.

Планам племянной работы на 1990—2005 гг. прадугледжана выкарыстаць галштынскіх быкоў у сістэме ратацыі ліній у гаспадарках усіх катэгорый. Пры гэтым рэкамендуецца чаргаванне ліній галандскага і галштынскага паходжання, а ў гаспадарках з трывалай кармавой базай і ў раёнах, якія прылягаюць да буйных прамысловых цэнтраў, можна выкарыстоўваць быкоў толькі галштынскіх ліній. У гэтых зонах мэтазгодна ствараць статкі спецыялізаванага напрамку.

Станоўчы ўплыў галштынскай пароды пры скрыжаванні з іншымі пародамі на малочную прадукцыйнасць і іншыя добрыя якасці жывёлін даказаны многімі даследчыкамі. Аднак да апошняга часу пытанне аб долі прыліцця галштынаў застаецца спрэчным. Даследаваннямі ў гаспадарках Маскоўскай вобласці [4] устаноўлена, што кроўнасць жывёлін пажаданага тыпу па галштынскай пародзе павінна складаць прыкладна 5/8, а ў радзе гаспадарак яе намечана павысіць да 7/8. Існуюць даныя [1], што ў 3/4-кроўных кароў у параўнанні з 1/2-кроўнымі ўдой павышаецца нязначна — толькі на 12 кг, а выхад малочнага тлушчу — на 1 кг.

Помесі з 25% крыві галштынаў ад зваротнага скрыжавання з быкамі чорна-пярэстай пароды па малочнай прадукцыйнасці і колькасці тлушчу ў малацэ адпавядалі зыходнай пародзе. Тлумачаць гэта тым, што племянная каштоўнасць чорна-пярэстых быкоў з'яўляецца прыкметна больш нізкай, чым імпартаваных галштынскіх [2].

Выяўлена пэўнае пагаршэнне ўзнаўленчых якасцей у мяшаных жывё-

Табліца 1. **Параўнальныя вынікі выкарыстання кароў рознай кроўнасці па галштынах на працягу трох лактацый**

Паказчык	Група			
	чорна-пярэстая (n=14)	галштынская (n=14)	1/2-кроўныя па галштынах (n=17)	3/4-кроўныя па галштынах (n=15)
Першая лактацыя				
Дойных дзён	286,2±10	300,6±13	313,6±21,2	323,5±14
Удой за 305 дзён, кг	4706±191	5571±216	5049±231	5635±275**
Колькасць тлушчу ў малацэ:				
кг	3,72±0,04	3,78±0,05	3,75±0,05	3,76±0,04
%	174,2±5,9	211,4±9,6**	188,7±9,1	211,9±11,2**
Жывая маса, кг	440±5,3	459±10,6	478±9,2*	479±8,5*
Сервіс-перыяд, дзён	70,6±10,2	75,8±9,5	90,3±19,9	103,7±14
Другая лактацыя				
Дойных дзён	294,8±9,1	318,2±2,0	281,6±8,47	287,7±7,2
Удой за 305 дзён, кг	4786±228	5731±253**	5047±259	5788±225**
Колькасць тлушчу ў малацэ:				
%	3,82±0,04	3,86±0,03	3,83±0,03	3,70±0,06
кг	182,3±8,5	221,6±11*	192,8±10,1	220,8±11,4*
Жывая маса, кг	482±5,9	509±6,5**	516±10,3**	527±9,7***
Міжацёлачны перыяд (першы-другі ацёл), дзён	342,9±9,6	364,3±12,8	353,1±14,4	368,8±12,1
Сервіс-перыяд, дзён	81,1±10,8	100,1±20	66,4±9,9	74,9±9,2
Трэцяя лактацыя				
Дойных дзён	274,7±6,7	330,3±14	306,6±16,6	299,3±13,9
Удой за 305 дзён, кг	5204±239	5836±180*	5187±159	5758±153*
Колькасць тлушчу ў малацэ:				
%	3,79±0,05	3,73±0,02	3,80±0,03	3,75±0,04
кг	196,6±8,4	219,9±7,1*	197,3±6,9	215,3±5,6*
Жывая маса, кг	539±3,9	568±7***	551±5,3	574±7,7***
Міжацёлачны перыяд (другі-трэці ацёл), дзён	359,2±11,1	396,3±25,3	366,1±21,3	354,7±8,7

*$P < 0,05$; **$P < 0,01$; ***$P < 0,001$.

лін [3]: у чорна-пярэстых аднагодкаў сервіс-перыяд складаў 108,4 дня, у помесей з 50% крыві галштынаў — 127,3, а 75% — 121,0 і з 25% — 109,9 дня. На адно апладненне ў чорна-пярэстых кароў затрачвалі ў сярэднім 1,86 асемянення, у помесей — 2,08. Аднак у аптымальных умовах кармлення і догляду па ўзнаўленчых якасцях помесі не ўступалі аднагодкам мацярынскай пароды.

Для вывучэння малочнай прадукцыйнасці і ўзнаўленчых якасцей кароў розных генатыпаў намі праведзены два доследы.

Вялікую цікавасць уяўляе параўнальнае даследаванне кароў рознай кроўнасці на працягу рада лактацый. Дзеля гэтага ў племзаводзе «Ведрыч» былі падабраны чатыры групы кароў: галштынскай пароды, 1/2-, 3/4-кроўных па галштынах і чорна-пярэстай пароды. Каровы знаходзіліся ў аднолькавых умовах кармлення (выкарыстоўваліся нормы ВІЖа) і догляду. У апрацоўку атрыманых матэрыялаў уключаны толькі жывёліны, якія паспяхова закончылі тры лактацыі з 25 пяршачак, пастаўленых на доследу кожную групу.

Як відаць з табл. 1, раздой кароў у розных групах адбываўся неаднолькава. Жывёліны галштынскай пароды і яе помесі раздаіліся да высокіх удояў, пачынаючы з першай лактацыі, і захоўвалі высокую пра-